Першы квартал 2024 года адзначыўся мноствам падзей. Прайшло шмат мерапрыемстваў, прысвечаных адкрыццю Года якасці, адраджэнню культуры і духоўнасці, патрыятычнаму, грамадзянскаму і сямейнаму выхаванню. Работнікі бібліятэчных устаноў раёна звярнулі асаблівую ўвагу на папулярызацыю здаровага ладу жыцця.

## Год якасці

2024 год у Беларусі абвешчаны Годам якасці. У Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі аформлены вітраж «Беларусь – краіна са знакам якасці» і кніжная выстава «Беларусь: накіраванасць на будучыню», прысвечаныя Году якасці.

**20 студзеня** ў інтэграванай бібліятэцы аг. Дэмбрава прайшло пасяджэнне жаночага клуба «Берагіня» на тэму «За якасцю – сучаснасць і будучыня». Кажучы пра якасць, мы не застаёмся ўбаку: бібліятэка заўсёды аказвае якасную інфармацыйную падтрымку ўсім, хто звяртаецца да нас у пошуках інфармацыі і дакументаў! Падчас мерапрыемства жанчыны разважалі пра якасць жыцця насельніцтва Беларусі, пра якасць у сферы адукацыі, аховы здароўя, культуры, сферы абслугоўвання.

**20 студзеня** Астрынская гарпасялковая бібліятэка правяла адкрыццё Года якасці «Якаснай працы цешыць вынік». Гасцямі сустрэчы сталі былы галоўны аграном калгаса, партарг мясцовага калгаса «Савецкая Беларусь», і пазней –



старшыня Астрынскага сельскага выканкама Васілевіч Мікалай Уладзіміравіч і былы галоўны інжынер, потым начальнік Астрынскага ПМК-20 Цагельнік Міхал Сцяпанавіч. У сваіх выступах расказвалі пра працоўны шлях, пра тое, што зроблена ў пасёлку пры іх удзеле, звярнуліся да дзяцей сказаным на дарогу словам. Далей гутарка ішла пра любоў да Беларусі, пра важнасць якаснай прадукцыі для эканомікі краіны, пра сувязь пакаленняў і ролі моладзі ў развіцці эканомікі краіны, пра тое, што кожны з нас можа зрабіць у гэтым накірунку. Расказалі вядучыя пра Сусветны Дзень якасці, яго асаблівасці і традыцыі, а таксама пра конкурс лагатыпаў на беларускія тавары і іх пераможцаў. З цікавасцю прагледжана была прэзентацыя «2024 – Год якасці».

**21 студзеня** Бакштаўская сельская бібліятэка сабрала сваіх чытачоў на гутарку-абмеркаванне «Крокі да паспяховай якасці». У гутарцы з чытачамі бібліятэкарам былі закрануты пытанні эканамічнага і сацыяльнага развіцця Шчучынскага раёна і Васілішкаўскага сельсавета. Прысутныя актыўна бралі ўдзел у гутарцы, выказвалі свае думкі. Пад канец мерапрыемства азнаёміліся з кніжнай выставай «2024 – прыярытэт на якасць».



**21 студзеня** Навадворская сельская бібліятэка запрасіла сваіх чытачоў на інфарм-дайджэст «Якасць – гэта рух наперад». Бібліятэкар расказала, на што будзе зроблены акцэнт у рамках

Года якасці, чаму плануецца надаць асаблівую ўвагу сёлета. Усе людзі, асабліва маладое пакаленне, павінны планаваць і дамагацца падвышэння якасных паказнікаў свайго жыцця. Удзельнікі інфарм-дайджэста пазнаёміліся з матэрыялам тэматычнай выставы «Беларусь – дзяржава са знакам якасці».

**23 студзеня** ў Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі да Года якасці прайшла адкрытая сустрэча «Якасць – брэнд Беларусі». Жывым і займальным быў выступ намесніка дырэктара па навучальна-метадычнай працы ДУА «Шчучынскі палац творчасці дзяцей і моладзі», якая атрымала грант Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на стварэнне міні-музея «Канструктар» для развіцця дзяцей г. Шчучына. Была праведзена дэманстрацыя мадэляў-экспанатаў, якіх запраграмавалі самі дзеці.




**25 студзеня** да адкрыцця Года якасці Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка запрасіла вучняў на інфармацыйны навігатар “Ад якасці паслуг да якасці жыцця”. Напачатку мерапрыемства навучэнцы разважалі, што азначае паняцце “якасць” у агульным сэнсе гэтага слова, потым бібліятэкар расказала, як у нашай краіне клапоцяцца пра якасць

жыцця грамадзянаў. З дапамогай прэзентацыі "Брэнды, народжаныя гісторыяй" дзеці даведаліся пра асноўныя айчынныя прадпрыемствы, вядомыя ва ўсім свеце. Пад канец школьнікаў пазнаёмілі з матэрыяламі кніжнай выставы "Беларусь пад знакам якасці".



**25 студзеня** Тур'янская сельская бібліятэка запрасіла сваіх чытачоў на мультымедыйны круіз "Лепшы вопыт - для лепшага жыцця". Падчас мерапрыемства вялася гутарка пра дасягненні эканомікі Беларусі, якасць прадукцыі, пра тое, што дабрабыт жыхароў нашай краіны мы можам забяспечыць толькі сваёй працай. Запрошаны на мерапрыемства старшыня Шчучынскага сельскага выканаўчага камітэта Возны С. Я. расказаў пра павышэнне якасці жыцця людзей у сельскай мясцовасці. Напрыканцы прысутныя пазнаёміліся з кніжнай выставай "Якасць для будучыні".



Да адкрыцця Года якасці Ракавіцкая сельская бібліятэка **28 студзеня** правяла пазнавальнае падарожжа «Якасць. Патэнцыял. Традыцыі». Чытачы даведаліся пра ключавую ролю якасці ў забеспячэнні ўстойлівага развіцця дзяржавы і задавальнення

запытаў грамадзянаў і значнасці якасці ў жыццядзейнасці грамадства. Падчас мерапрыемства паразважалі пра якасць жыцця насельніцтва Беларусі, пра якасць у сферах адукацыі, аховы здароўя, культуры і абслугоўвання. Сабраныя пазнаёміліся з тэматычнай выставай «Наша праца табе, Беларусь».

## 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

**19 студзеня** ў Астрынскай гарпасялковай бібліятэцы прайшло пасяджэнне клуба «Спадчына» пад назвай «Гэта трэба ведаць», прысвечанае Міжнароднаму Дню памяці ахвяр Халакосту. Аповед пра «Крыштальную ноч» і падзеі ў Бабіным Яры не пакінуў удзельнікаў абыякавымі. Прагучалі вершы, прысвечаныя падзеям тых гадоў. Другая частка пасяджэння была прысвечана Халакосту ў Беларусі: работа камісій па пошуках ахвяр Халакосту, колькасць помнікаў у месцах пахаванняў, работа па захаванні памяці, Трасцянец, лагер-гета ў Гродна і ў Шчучынскім раёне – усё гэта знайшло адлюстраванне ў дыялогу. Даведаліся дзеці, хто такія Праведнікі Міра, пра выхадца з Астрына, якая носіць гэтае імя. Пазнаёміліся з новымі спісамі загінулых у Астрынскім гета.

У Бакштаўскай сельскай бібліятэцы прайшоў урок памяці «Халакост. Попел вайны» да Міжнароднага дня памяці ахвяр Халакосту. На мерапрыемства сабраліся неабыякавыя людзі, хто ведае жахі Вялікай Айчыннай вайны не толькі з друкаваных выданняў, але і па аповедах сваіх бацькоў. Сабраным было цікава даведацца, што на

тэрыторыі былога Васілішкаўскага раёна за гады той вайны было расстрэляна 2707 чалавек і сагнана ў нямецкае рабства 3463 чалавекі. Памяць пра Халакост – гэта спосаб недапушчэння падобных трагедый у будучыні.



**24 студзеня** ў Астрынскай гарпасялковай бібліятэцы прайшоў марафон памяці «Нашай памяці боль», прысвечаны 80-годдзю спалення нямецка-фашысцкімі захопнікамі в. Зінякі. Бібліятэкар з хваляваннем распавядала пра тыя страшныя падзеі, шырока выкарыстоўваліся ўспаміны жыхароў в. Зінякі, фотаматэрыялы. Цікавай стала інфармацыя пра выратаваных у той страшны дзень жыхароў вёскі і іх далейшы лёс. Пазналі сабраныя пра тое, калі і якія помнікі былі пастаўлены ў Зіняках, а прэзентацыя «Вогненная вёска Зінякі» дапамагла ўбачыць гэтыя помнікі і ход адкрыцця мемарыяла. Дзеці паглядзелі кнігу «Нельзя забыть. Нельзя простить. Нельзя оправдать», даведаліся і пра іншыя месцы зверстваў фашыстаў у нашым раёне.

# Акцыя аднаго дня “Родная мова” да Міжнароднага дня роднай мовы



**21 лютага** адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. У Шчучынскай дзіцячай бібліятэцы на працягу дня дэманстраваліся мультфільмы на беларускай мове, рабілі фота з кнігай, адгадвалі загадкі, збіралі прыказкі. У рамках акцыі «Гавары са мной па-беларуску» на працягу дня з карыстальнікамі бібліятэкай размаўлялі на беларускай мове.

**21 лютага** ў Жалудоцкай гарпасялковай бібліятэцы прайшоў турнір знаўцаў “З роднай моваю на "ты"”. Дзеці з задавальненнем спаборнічалі паміж сабой: адгадвалі загадкі і рэбусы, выпраўлялі



памылкі, гулялі ў перакладчыкаў, а таксама пашыралі свае веды ў пазнанні беларускіх прыказак і прымавак. Удзельнікі на “выдатна” выканалі ўсе заданні і атрымалі салодкія прызы.

У інтэграванай бібліятэцы аграгарадка Дэмбрава для вучняў старэйшых класаў ДУА “Дэмбраўская сярэдняя школа” была арганізавана гульня-конкурс “Ведай і любі родную мову”. У спаборніцтве на лепшае валоданне беларускай мовай ўдзельнічалі дзве каманды “Знаўцы” і “Разумнікі”. Ім

было прапанавана паўдзельнічаць у шэрагу конкурсаў пад назвамі: “Самы кемлівы”, “З народнай мудрасці”, “Пазнай твор па яго пачатку”, “Спрыт, знаходлівасць і розум”, “Аматары беларускага фальклору” і іншых. Па выніках гульні перамагла каманда “Знаўцы”. Усе удзельнікі праявілі свае веды, кемлівасць і знаходлівасць і даказалі, што ведаюць і любяць сваю родную мову. Завяршылася мерапрыемства знаёмствам з кніжнай выставай “Роднай мовы гук чароўны”.



**21 лютага** Тур’янская сельская бібліятэка запрасіла выхаванцаў дзіцячага сада на паэтычную гадзіну “Мова родная – мова жывучая”. Падчас сустрэчы бібліятэкар звярнула ўвагу прысутных на тым, якая прыгожая і мілагучная наша беларуская мова, на якой гаварылі нашы продкі. Дзеці з захапленнем слухалі і чыталі вершы, казкі, лічылкі знакамітых беларускіх пісьменнікаў У. Мазго, А. Вольскага, А. Зэкава і інш. Успомнілі, як прыгожа гучаць на беларускай мове ветлівыя словы “калі ласка”, “дзякуй”, “добры дзень” і іншыя. З вялікай цікавасцю разгадвалі загадкі. Да мерапрыемства была аформлена кніжная выстава “Жывое беларускае слова”. Сустрэча завяршылася праглядам мультфільмаў беларускіх народных казак.

**21 лютага** ў Навадворскай сельскай бібліятэцы прайшлі літаратурныя чытанні “Сэрцам роднага слова краніся”. Вучні ДУА “Навадворская сярэдняя школа”

уважліва слухалі цікавыя звесткі з гісторыі развіцця беларускай мовы, пра неабходнасць яе захавання. Бібліятэкар пазнаёміла вучняў з беларускімі пісьменнікамі-юбілярамі гэтага года, з іх творамі. Гучалі вершы на беларускай мове і пра беларускую мову. Быў праведзены агляд літаратуры беларускіх аўтараў з кніжнай выставы “Мова маёй Радзімы”.

**21 лютага** Ракавіцкая сельская бібліятэка правяла літаратурны турнір “Лепшы чытальнік роднай мовы”. Дзецям прапанавалі акунуцца ў чароўны свет роднай мовы, паслухаць, як яна гучыць. На працягу мерапрыемства удзельнікі адчулі прыгажосць і хараство роднай мовы. Быў вызначаны лепшы чытальнік вершаў класікаў беларускай літаратуры: Я. Купалы, Я. Коласа, М. Танка і інш. Актыўны ўдзел дзеці прынялі ў інтэрактыўнай гульні “Прыказкі і прымаўкі” і конкурсе “Расшыфруй прыказку”, праявілі не толькі кемлівасць, уважлівасць і знаходлівасць, але і разгадалі таямніцы значэння беларускіх слоў, адказалі на пытанні, звязаныя з дзейнасцю і побытам беларускага народа.



**21 лютага** бібліятэкары Астрынскай гарпасялковай бібліятэкі правялі урок ў музеі “Гімн

родней мове”. Бібліятэкар расказала вучням прытчу аб Эзопе і яго выказванні аб мове, аб каштоўнасці роднай мовы і яе значэнні для кожнага народа. Былі прыведзены цікавыя факты аб знікаючых мовах. Затым вучням было прапанавана паўдзельнічаць ў конкурсе. Каманды “Валошкі” і “Буслікі” ўспаміналі выказванні паэтаў аб беларускай мове, чыталі вершы беларускіх паэтаў, прысвечаныя роднай мове, прынялі ўдзел у бліцтурніры па фразіалагізмам.



## Культура і духоўнасць

**14 сакавіка** ў інтэграванай бібліятэцы аграгарадка Дэмбрава прайшла гадзіна духоўнай культуры «Духоўных праўд ніці залатыя», на якім праз вэб-агляд «Праваслаўны інтэрнэт» дзеці пазнаёміліся з праваслаўнымі сайтамі «Міласэрнасць», «Праваслаўе», «Багаслоў», «Азбука веры». Быў праведзены агляд літаратуры праваслаўнай і духоўна – маральнай тэматыкі «Праз кнігу да дабра і святла», які даў магчымасць даведацца пра важнасць веры для чалавека, пазнаёміцца з творамі праваслаўных пісьменнікаў.

**17 сакавіка** ў Астрынскай гарпасялковай бібліятэцы прайшоў Дзень праваслаўнай кнігі «Жыватворная крыніца праваслаўнай кнігі», на якой бібліятэкар расказала дзецям пра віды духоўнай літаратуры. Ішла гутарка пра сумленне, міласэрнасць, адказнасць за свае ўчынкі. Напрыканцы дзеці пазнаёміліся з фондам духоўнай літаратуры.



Духоўная размова “Вечныя каштоўнасці жыцця” прайшла **14 сакавіка** ў Ракавіцкай сельскай бібліятэцы, на які дзецям былі прадстаўлены самыя галоўныя праваслаўныя кнігі. Цікава і даступна было расказана пра значэнне кнігі ў духоўным жыцці, пра лёс першай друкаванай кнігі на Русі. Была аформлена кніжная выстава «Праз кнігу да вытокаў духоўнасці», на якой чытачы знайшлі для сябе цікавую літаратуру.



# Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь

Канстытуцыя ўтрымвае велізарны патэнцыял для развіцця ўсіх сфер жыццядзейнасці чалавека.

**14 сакавіка** ў Публічным цэнтры прававой інфармацыі пры аддзеле абслугоўванні і інфармацыі Шчучынскай раённай бібліятэкі імя Цёткі прайшла гадзіна прававых ведаў «Канстытуцыя – як аснова нацыянальнага адзінства», на якім інспектар ІСН і загадчык юрыдычнай кансультацыі Шчучынскага раёна ў даступнай форме данеслі да дзяцей інфармацыю пра правы і абавязкі непаўналетніх.



**14 сакавіка** бібліятэкар бібліёбуса пазнаёміла жыхароў аг. Тапілішкі з тэматычнай выставай «Канстытуцыя – аснова стабільнасці і росквіту».

**15 сакавіка** ў Бакштаўскай сельскай бібліятэцы прайшла гадзіна права «Закон, па якім мы жывём», на якім удзельнікі паспаборнічалі ў ведах, прынялі ўдзел у віктарыне. Быў прадэманстраваны фільм «Ганаруся табой, Беларусь».

**15 сакавіка** ў Жалудоцкай гарпасялковай бібліятэцы ўдзельнікі аматарскага аб’яднання

«Бяседа» сабраліся на пасяджэнне «Мы - грамадзяне Рэспублікі Беларусь», падчас якога была праведзена тэматычная віктарына «Ці ведаеш ты закон?». Удзельнікі звярнуліся да прававой базы «Эталон» за прававымі дакументамі.

**16 сакавіка** ў Астрынскай гарпасялковай бібліятэцы адбыўся грамадзянскі форум «Наша Канстытуцыя — гарант нашых праў».

## Месячнік маладога выбаршчыка «Моладзі – выбіраць!»

**20 студзеня** ў рамках месячніка маладога выбаршчыка «Моладзі – выбіраць!» у Бакштаўскай сельскай бібліятэцы прайшла інфармацыйная гадзіна «Чытаем. Думаем. Абіраем». Бібліятэкар расказала прысутным пра значнасць выбарчай кампаніі для беларускай дзяржавы, адказала на пытанні маладых выбаршчыкаў.

**24 студзеня** ў Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі прайшла гадзіна прававой інфармацыі «Ведаць выбарчае права – тваё права» для вучняў 10 класа ДУА «Сярэдняя школа №1 г. Шчучына». На мерапрыемстве, у якой узяла ўдзел адвакат юрыдычнай кансультацыі Шчучынскага раёна Дятчык Кацярына Сяргееўна, падымаліся пытанні, злучаныя з выбарчым правам і выбарчым працэсам. Бібліёграф прадэманстравала электронную прэзентацыю «Будучаму выбаршчыку», правяла агляд літаратуры ў кніжнай выставе «Зрабіць выбар –

наш абавязак і наша права».



У Астрынскай гарпасялковай бібліятэцы прайшоў інфармацыйны дайджэст «Я галосую першы раз». Дзеці даведаліся, якія дакументы рэгламентуюць ход выбараў, у чым асаблівасць выбараў 2024 года, як праходзяць выбары і што трэба ведаць тым, хто ідзе галасаваць упершыню. Напрыканцы яны пазнаёміліся з матэрыяламі на выставе «Выбарчая кампанія: крок за крокам».

**31 студзеня** ў Васілішкаўскай сельскай бібліятэцы прайшла гадзіна прававой адукаванасці «Сёння вучань – заўтра выбаршчык». Будучыя выбаршчыкі даведаліся, што такое выбары і для чаго яны патрэбныя, пра працэдуру галасавання, пра ролю выбарчых праў у жыцці грамадзяніна. Увазе ўдзельнікаў мерапрыемства была прадстаўлена кніжная выстава «Выбары – справа ўсенародная».



**7 лютага** Жалудоцкая гарпасялковая бібліятэка правяла гадзіну інфармацыі «Зрабіць выбар твой абавязак і тваё права» для вучняў старэйшых класаў ДУА «Жалудоцкая сярэдняя школа імя В. Урублеўскага». Падчас мерапрыемства бібліятэкар растлумачыла, чаму патрэбна браць удзел у выбарах, хто такі выбаршчык і з якога узросту можна галасаваць. Дзеці пазнаёміліся з матэрыяламі тэматычнай выставы «Наш выбар – наша будучыня».

**9 лютага** ў інтэграванай бібліятэцы аграгарадка Дэмбрава прайшла экспрэс-інфармацыя “Выбары і моладзь”. Былі разгледжаны парадак галасавання і працэдура падвядзення вынікаў. Дзеці даведаліся аб правілах запаўнення бюлетэня для галасавання, пазнаёміліся з тэматычнай выставай “Зрабі свой выбар”.



## Літаратурная старонка

**3 студзеня** ў інтэграванай бібліятэцы аграгарадка Дэмбрава для дзяцей з прышкольнага лагера «Вясёлка» прайшло літаратурнае рэвю «Талент, аддадзены дзецям», прысвечанае 120-годдзю з дня нараджэння А. Якімовіча.



Напачатку мерапрыемства бібліятэкар расказала пра тое, што ў апрацоўцы Алеся Іванавіча асобнымі выданнямі выйшла шмат беларускіх казак, а таксама складанкі “Каток – залаты лабок”, “Людзей слухай, а свой розум май”, “Бацькаў дар”, “Андрэй за ўсіх мудрэй». Алесь Якімовіч быў сапраўдным казачнікам і яго казкі любяць і чытаюць дзеці розных вякоў, бо яны вучаць каханні да сваёй зямлі, да людзей, мудрасці і дабрыні. Скончылася мерапрыемства анлайн-праслухоўваннем казкі «Першае яечка».

**5 студзеня** ў Астрынскай гарпасялковай бібліятэцы прайшло знаёмства з аўтарам «Кнігі разумныя і добрыя», прысвечанае 120-годдзю з дня нараджэння А. Гайдара. Дзеці з прышкольнага лагера параўналі кнігі, выдадзеныя ў XX стагоддзі, і сучасныя, адказалі на пытанні віктарыны і пачулі вершы пра пісьменніка. Зацікавіла дзяцей апавяданне пра версіі з’яўлення псеўданіма «Гайдар» і ўспаміны пра яго сёстраў і сына. Да мерапрыемства была аформлена выстава «Пісьменнік, карэспандэнт, герой».

У Ракавіцкай сельскай бібліятэцы прайшоў літаратурны агляд “З глыбіні роднага краю”, прымеркаваны да 100-годдзя з дня нараджэння А. Савіцкага. Дзеці праслухалі ўрывак з рамана «Зямля не раскажа» пра лёс беларускай жанчыны Рэнаты, якая адважна змагалася з ворагам, якая аддала жыццё за шчасце сваіх дзяцей, за родную зямлю. Творы А. Савіцкага прызначаны маладому пакаленню, што не бачыла вайны, і разлічана на ўважлівае неабыякавае чытанне.

Тур’янская сельская бібліятэка запрашала на літаратурнае падарожжа “Чараўнік з краіны

дзяцінства” да 120-годдзя з дня нараджэння А. Якімовіча. Бібліятэкар пазнаёміла з літаратурай на кніжнай выставе “Сябар і настаўнік”. Дзеці слухалі чароўныя казкі, чыталі творы аўтара, падзяліліся сваімі ўражаннямі ад прачытанага.

**17 студзеня** ў Васілішкаўскай сельскай бібліятэцы прайшло мерапрыемства, прымеркаванае да 120-годдзя з дня нараджэння беларускага пісьменніка Алеся Якімовіча. Цікавасць выклікаў зборнік беларускіх народных казак «Каток – залаты лабок» у апрацоўцы пісьменніка. Дзеці разглядалі зборнік казак, радасна пазнаючы любімую казку, і пераказвалі эпізоды з іх. Для чытання ўслых і абмеркавання была абрана казка “Казка пра смелага вожыка». Дзеці чыталі казку па ролях і давалі характарыстыку галоўным героям.



**17 студзеня** Астрынская гарпасялковая бібліятэка правяла знаёмства з пісьменнікам «Напісана на хвалі часу...», прысвечанае 120-годдзю з дня нараджэння Алеся Якімовіча. Мерапрыемства прайшло ў рамках праекта «Урок у музеі». Дзеці пазнаёміліся з абранымі кнігамі, чыталі разам апавяданне, паэтычныя казкі. Рэбусы прапанавала дзецям захавальнік музея Цёткі, а бібліятэкар прадставіла навінкі літаратуры.

**19 студзеня** ў Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі адбылося пасяджэнне літаратурна-музычнай гасцёўні «Ад усёй душы» пад назвай «Час чытаць класіку!», прысвечанае літаратурным юбілеям. Удзельнікі мерапрыемства ўспаміналі і чыталі напамяць вершы А.С. Пушкіна, выконвалі рамансы на словы паэтаў. Прагучалі ўрыўкі з пецярбургскіх аповесцяў М. Гогаля. Цікавасць прысутных выклікалі карціны і скульптурныя выявы, прысвечаныя класікам. Эмацыйным фіналам сустрэчы стаў раманс «Выходжу адзін я на дарогу» на вершы Лермантава ў выкананні Ганны Герман.



**9 лютага** бібліятэкары Астрынскай гарпасялковай бібліятэкі запрасілі на гульнявы модуль «Пра родную прыроду – для дзяцей», прысвечаны 130-годдзю з дня нараджэння рускага пісьменніка-прыродазнаўца Віталя Біянкі. Дзеці ўспаміналі кнігі аўтара, бралі ўдзел у «Аўкцыёне жывёл», спявалі песню «У лесе нарадзілася ялінка…». Заканчэннем сустрэчы стала знаёмства з аднайменнай выставай кніг юбіляра.

## Фарміраванне інфармацыйнай культуры



Спецыялісты ДУК «Шчучынская раённая бібліятэка імя Цёткі» штомесячна праводзяць выязныя дні інфармацыі на прадпрыемстве Шчучынскі філіял ААТ "Малочны Мір". Супрацоўнікі бібліятэкі прадстаўляюць кніжныя і часопісныя навінкі.

## Павышэнне прафесійнага майстэрства



**26 студзеня** ў Шчучынскай раённай бібліятэцы імя Цёткі прайшла школа вучобы «Патрабаванні па вядзенні бібліятэчнай дакументацыі. Камп'ютарная бяспека. Абарона дадзеных ад злачынцаў». Былі разгледжаны актуальныя пытанні па запаўненні новых формаў справаздачнасці і патрабаванні па вядзенні бібліятэчнай дакументацыі. Абмеркавалі масавую працу ў рамках абласных і раённых конкурсаў і акцый. На мерапрыемстве казалі пра асноўныя небяспекі, якія могуць чакаць супрацоўнікаў, якія працуюць за камп'ютарам. Інжынер-праграміст расказаў пра выпадкі заражэння камп'ютараў працаўнікоў розных сфер паслуг.

**20 сакавіка** супрацоўнікі аддзела камплектавання, апрацоўкі і арганізацыі адзінага фонду Шчучынскай раённай бібліятэкі імя Цёткі правялі семінар для бібліятэкараў раёна «Сутнасць і прынцыпы фарміравання бібліятэчнага фонду». Былі разгледжаны пытанні камплектавання, арганізацыі і выкарыстання бібліятэчных фондаў, асветлены пытанні размяшчэння фондаў пры адкрытым доступе і крытэрыі адбору дакументаў на выключэнне.




Супрацьдзеянне пашырэнню інфармацыйнай прадукцыі экстрэмісцкага характару пры фарміраванні і выкарыстанні бібліятэчных фондаў асвятліў пракурор Шчучынскай раённай пракуратуры Велічка О.В. Праведзены практычныя заняткі па асваенні навыкаў складання спіса дакументаў па запытанай карыстальнікамі тэме з выкарыстаннем электроннага каталога.



# Нашы дасягненні

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь аб’явіў Падзяку Сцяпанчанка Ганне Аляксандраўне, бібліятэкару Астрынскай гарпасялковай бібліятэкі, за шматгадовую плённую працу і высокі прафесіяналізм.




Намеснік дырэктара Ю.А. Міхайлава